ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 79 (1046) | СУБОТА, 5-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Усім АК, РК і ячэйкам КП(б)Б

ЦК КП(б)Б прапануе неадкладна прапрацаваць артыкул тав. Сталіна—„Адказы т.т. колгасьнікам“ і пастанову ЦК УсеКП(б) аб ільготах колгасам на сходах парт'ячэек, на райпартсходах і г. д.

ЦК КП(б)Б прапануе адначасова разгарнуць шырокую кампанію па папулярызацыі гэтага артыкулу тав. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) сярод шырокіх мас рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на папулярызацыю гэтых дакумантаў сярод колгасьнікаў.

Сэкратар ЦК КП(б)Б
ВАСІЛЕВІЧ.

Замацаваньне для далейшага наступу

Шлях суцэльнай колектывізацыі ёсьць складаны, пяжкі шлях клясавай барацьбы. Спробы абыйсьці, а ня зьнішчыць цяжкасьці, забягаць наперад, не забясьпечыўшы тылу, карыстаючыся адным авангардам, адарваўшыся ад асноўных сіл, гэткія спробы амаль заўсёды церпяць паражэньні і прыносяць вялізарную шкоду ўсяму руху.

Абвешчаная ўчора пастанова ЦК УсеКП(б) аб ільготах для калгасаў зьявіцца магутным сродкам замацаваньня посьпехаў і створыць умовы для працягу шырокага і забясьпечанага наступу на фронце колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Нельга абмежавацца толькі адным растлумачэньнем будучых пераваг буйнай колгаснай гаспадаркі перад дробнай, трэба, каб сярэдняе сялянства і вясковая бедната ўжо зараз, сёньня, рэальна адчувалі перавагі колгасу не наогул, а перавагі для сябе ў колгасе, у параўнаньні з індывідуальнымі гаспадаркамі.

Ажыцьцяўляць адно з асноўных ленінскіх палажэньняў

Правыя прыхільнікі тэорыі „самацёку“ могуць колькі хочуць даводзіць, што гэткія вялікія ільготы роўналежны парушэньню прынцыпу добраахвотнасьці. Яны тым самым пакажуць толькі сваё поўнае неразуменьне ленінскай добраахвотнасьці ў калгасным руху.

Ленін гаварыў: „кожны грамадзкі лад узьнікае толькі пры фінансавым падтрыманьні пэўнай клясы. Няма чаго напамінаць аб тых сотнях мільёнаў рублёў, якія каштавала нараджэньне „вольнага“ капіталізму. Зараз мы павінны прызнаць, што ў сучасны момант той грамадзкі лад, які мы павінны падтрымліваць звыш звычайнага, ёсьць лад коопэрацыйны“. Фінансаваньне пануючай клясай пролетарыяту новага „грамадзкага ладу“, колгасна-коопэрацыйнага ладу, ёсьць выкананьне аднаго з асноўных ленінскіх палажэньняў.

Галавацяпствам, галавакружэньнем ад посьпехаў і часткова палітычнай провокацыяй трэба тлумачыць тую энэргію, якая ў многіх мясцох была выяўлена ў справе спагнаньня рознай завінавачанасьці, рознай недаімачнасьці і розных узносаў, па-за ўсялякага вучоту плацежаздольнасьці толькі яшчэ організаваўшыхся колгасаў і колгасьнікаў.

Забясьпечыць выкананьне пастановы аб ільготах для колгасаў

Забараняючы практыку прымусовага збору паявых капіталаў і мэтавых укладаў у крэдытныя таварыствы і коопэрацыю, пастанова зьнімае з колгасьнікаў завінавачанасьць па зямляўпарадкаваньню, штрафы і судовыя спагнаньні, зьвязаныя з невыкананьнем сельска-гаспадарчых падаткаў, недаімак і г. д.

Вялікія ільготы атрымоўваюць колгасы і колгасьнікі па падатковаму абкладаньню. Поўнае вызваленьне ад падаткаў усёй рабочай, продукцыйнай і дробнай жывёлы ў колгасах, як аграмаджанай, так і тэй, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні колгасьнікаў, поруч з вялікімі ільготамі па абкладаньню агародаў у колгасах стварае для сярэдняга сялянства і беднаты вялізарныя перавагі іх гаспадарчай дзейнасьці ў колгасах у параўнаньні з індывідуальным гаспадараньнем.

Асабліва трэба адзначыць вызваленьне ад падатку продукцыйнай і дробнай жывёлы, якая знаходзіцца ў індывідуальным уладаньні колгасьнікаў.

Калі да ўсяго гэтага дадаць пацьверджаньне пастановы ЦК ад 5 студзеня аб крэдытаваньні колгасаў у гэтым годзе ў разьмеры 500 мільёнаў руб., і калі ўзяць пад увагу, што партыя зробіць усё для правядзеньня гэтай пастановы ў жыцьцё, будзе відавочным вялізарнае політычнае значэньне пастановы аб ільготах для колгасаў.

Заслугоўвае вялікай увагі пастанова аб дачы колгасьнікам магчымасьці працаваць на грамадзкіх конях, на ізвозных, лесазагатоўчых і інш. работах з атрыманьнем у сваю карысьць ад 40 да 50 пр. заробленай сумы (у залежнасьці ад таго, чый корм) ад гэткіх работ.

У чым значэньне крэдыту і ільгот

„Колгасы зьяўляюцца адзіным сродкам, які дае сялянам выхад з беднасьці і цемры“. (Сталін). „Таму савецкая ўлада будзе аказваць колгасам ільготы і перавагі перад індывідуальнымі гаспадаркамі. Гэта значыць, што яна будзе даваць колгасам ільготы ў сэнсе надзяленьня зямлёй, і ў сэнсе забясьпечаньня машынамі, трактарамі, насенным зярном і г. д., і ў сэнсе палегчаньня падатковага абкладаньня, і ў сэнсе прадстаўленьня крэдытаў“ (Сталін).

Гэтыя ільготы на даным этапе колгаснага руху, поруч з іншымі мерапрыемствамі, павінны прыпыніць адліў з колгасаў, стварыць умовы для замацаваньня ўнутры колгасаў асноўных колгасных кадраў і ўмовы для прыліву новых і звароту вышаўшых колгасьнікаў.

Крэдыт і ільготы колгасам маюць выключнае вытворчае значэньне іменна сёньня, у разгар сяўбы па поўдні і падрыхтоўкі палявых работ па ўсёй астатняй тэрыторыі краіны. Таму пастанова ЦК аб ільготах павінна быць безадкладна растлумачана кожнаму колгасьніку, кожнаму выступіўшаму і кожнаму ўступіўшаму ў колгас бядняцка-серадняцкаму двару.

Калі артыкул т. Сталіна „Галавакружэньне ад посьпехаў“ і пастанова ЦК ад 15 сакавіка аб скрыўленьні лініі ў колгасным руху зьнішчалі „асноўныя тормазы“ колгаснага руху, абвяшчаючы жорсткую барацьбу з перагібамі і скрыўленьнямі, дык пастанова ЦК аб ільготах для колгасаў і „адказы таварышам колгасьнікам“ тав. Сталіна зьявяцца тым гістарычным рухавіком, які ўпэўнена і паступова разьвіваючы тэмпы рушыць суцэльную колектывізацыю наперад па шляхох, ачышчаных ад замётаў, скрыўленьняў і перагібаў. Набыўшая вопыт папярэдняга руху, моцна падкаваная ільготамі і пролетарскімі крэдытамі, суцэльная колектывізацыя, як рух беднаты і сярэдняга сялянства да соцыялізму, пад кіраўніцтвам пролетарыяту, зьявіцца рашаючым этапам соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, прадоўжыць і давядзе да канца пачатую справу ліквідацыі кулацтва, як клясы.

(З перадавой „Праўды“).

Інформацыйныя паведамленьні

27—30-га сакавіка адбыўся пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б.

Пленум разгледзіў наступныя пытаньні:

1. Аб ходзе колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной кампаніі.
2. Аб ходзе выкананьня прамфінпляну.

Пленум ЦК пастанавіў увесьці кандыдатам у члены бюро ЦК КП(б)Б таварыша Хлеўнікава.

Змагацца на два франты за пасьлядоўна ленінскае ажыцьцяўленьне лініі партыі

Прамова тав. ГЕЯ пры закрыцьці пленуму

Таварышы, мы не маглі ў парадак дня нашага сёньнешняга пленуму ўключыць некаторыя пытаньні, якія ў цяперашні час трэба было б абмеркаваць. Мы выходзілі пры складаньні парадку дня нашага пленуму з неабходнасьці як мага менш часу затрымаць таварышоў з месц, у якіх праходзіць зараз надзвычайна важная работа на мясцох. Я думаю, аднак што пры закрыцьці работы пленуму трэба было-б сказаць некалькі слоў аб тым, што перад намі стаіць задача падрыхтавацца да надыходзячых перавыбараў партыйнай організацыі, і да надыходзячага зьезду нашай партыі. Вам трэба на мясцох зараз, пры правядзеньні перавыбараў партыйных органаў, падвесьці агульныя вынікі работы комуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі, не абмяжоўваючыся, зразумела, тымі пытаньнямі, якія сталі на парадку дня нашага сёньнешняга пленуму, але падагуліць становішча змаганьня з правым ухілам, які складаў асноўную небясьпеку на даным этапе нашага будаўніцтва,—змаганьня, якое партыя правяла з вялікім посьпехам. Вам прыдзецца падагуліць вынікі работы і змаганьня з нацыянал-дэмократызмам, які сваімі карэньнямі цясьнейшым чынам зьвязаны з права-опортуністычнай устаноўкай. У змаганьні з нацыянал-дэмократызмам партыя таксама мае цэлы рад посьпехаў і вялікае прасоўваньне наперад.

Вам прыдзецца пры падагульненьні вынікаў работы партыйнай організацыі сур'ёзна спыніцца і на такім пытаньні, як пытаньне разьвіцьця самакрытыкі і правядзеньня ўнутрыпартыйнай дэмократыі,—адной з асноўных задач работы нашай партыі, якую Цэнтральны Камітэт і нізавыя парторганізацыі ажыцьцяўляюць і павінны ажыцьцяўляць з усёй пасьлядоўнасьцю.

Сёньнешнія пастановы, пастановы данага пленуму, які сабраўся якраз на пераломным, на вельмі цяжкім моманце разьвіцьця нашай работы на вёсцы, даюць асноўныя устаноўкі па буйнейшых гаспадарча-політычных задачах партыі. Мне здаецца, што вынікі работы нашага пленуму ў пытаньні колектывізацыі могуць быць у самым кароткім, у самым сьціслым выглядзе зьведзены да таго, што нашай бліжэйшай задачай зьяўляецца арыентаваць партыю на безагаворачнае, пасьлядоўнае правядзеньне дырэктывы партыі аб добраахвотнасьці ў колгасным будаўніцтве; зламаць супраціўленьне тых, што су[пра]ціўляюцца, пераканаць растлумачэньнем тых, хто не разумее гэтай дырэктывы партыі і ажыцьцявіць правільную політыку ў справе колгаснага будаўніцтва.

Пры гэтым могуць быць і будуць настроі, якія сыгналізуюць аб іншай небясьпецы, аб чым вельмі добра і ўдала гаворыць рэзолюцыя апошняга пленуму Маскоўскага камітэту партыі:

„Побач з гэтым, пленум маскоўскага камітэту адзначае праяўленьне замешанасьці ў некаторых партыйных організацыях, адыход ад актыўнай работы па замацаваньню дасягнутага ўжо, адыход, які зьяўляецца ні чым іншым, як дэзэртырствам з фронту змаганьня з кулацтвам. Учарайшыя галавацяпы і „левыя“ загібшчыкі сёньня гатовы здаць поле змаганьня кулаку, які прабуе разбурыць саўгасы і колгасы і сарваць сяўбу, абарачваючыся тым самым у тыповых выяўнікоў дробна-буржуазных хістаньняў, у рупар дробна-буржуазнай стыхіі і саюзьнікаў правых опортуністых“.

На даным этапе ў гэтым конкрэтным пытаньні, як і ва ўсіх задачах партыі, нам трэба сыстэматычна змагацца таксама на два франты: змагацца супроць тых, хто супраціўляецца правядзеньню лініі партыі, хто супраціўляецца выпраўленьню сваіх памылак, змагацца супроць панікёраў, якія апускаюць рукі, пакідаюць поле бойкі бяз дачы бою кулаку.

Пастановы пленуму па пытаньнях прамфінпляну даюць зусім ясную ўстаноўку па цэлым шэрагу пытаньняў, ад якіх залежыць узьдым актыўнасьці рабочых мас, разьвіцьцё ўдарніцтва і соцыялістычнага спаборніцтва, правядзеньне ў жыцьцё пастановы аб бесьперапыннцы і пераход на 7-мі гадзінны рабочы дзень, правядзеньне ў жыцьцё пастаноў аб адзінаначальлі і рад іншых указаньняў рэзолюцыі, якія даюць правільную кіруючую лінію для пастаноўкі работы нашай прамысловасьці.

Гэтыя вынікі данага пленуму, натуральна, увойдуць як часьць у агульна-падрыхтоўчую работу партыі да надыходзячых партыйных конфэрэнцый і надыходзячага зьезду партыі.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ УМОВЫ ПАСЬПЯХОВАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ЗАДАЧ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Выканаць дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб крэдытаваньні колгасаў.—Вызваліць колгасную жывёлу ад абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам на працягу двух год. Растэрмінаваць пакрыцьцё тэрміновай запазычанасьці, зьняць іншыя запазычанасьці з колгасьнікаў, зьвязаныя з невыкананьнем с.-г. падатку і нядоімак

1. Прапанаваць ЦВК і СНК СССР:

а) вызваліць ад падатковага абкладаньня на два гады ўсю абагуленую рабочую жывёлу колгасаў: коняй, валоў і г. д.;

б) вызваліць ад падатковага абкладаньня на два гады кароў, сьвіней, птушак і авец, якія знаходзяцца як ва ўладаньні колектыўным, так і ў індывідуальным уладаньні колгасьнікаў;

в) устанавіць для абагуленых агародаў і агародных колгасаў 50-процантную скідку з вызначаных для данага раёну норм, у асаблівасьці агародных плошчаў. Плошчы, зноў абернутыя пад абагуленыя агароды і агародныя колгасы, вызваліць ад абкладаньня с.-г. падаткам на два гады;

г) згодна гэтых пастаноў, адпаведна скараціць суму с.-г. падатку на 1930-31 год.

2. Прапанаваць СНК СССР забясьпечыць поўнае выкананьне пастаноў ЦК ад 5 студзеня аб крэдытаваньні колгасаў у гэтым годзе ў разьмеры 500 мільёнаў руб.

У мэтах палепшаньня матар'яльнага становішча колгасаў:

а) пакрыцьцё пратэрмінаванай запазычанасьці па крэдытах, прыпадаючых на гаспадаркі, увайшоўшыя ў колгасы, а таксама пратэрмінаванай запазычанасьці, прынятай на сябе колгасамі ад сялян, што ідуць у колгасы, растэрмінаваць да канца гаспадарчага году пагашэньнем па частках у адпаведнасьці з паступленьнем прыбыткаў ад паляводзтва і жывёлагадоўлі;

б) зьняць з колгасьнікаў запазычанасьць па зямляўпарадкаваньню, праведзенаму да ўступленьня іх у колгасы;

в) зьняць штрафы і судовыя спагнаньні, зьвязаныя з невыкананьнем с-г павіннасьцяй, нядоімак і г. д., накладзеных да 1 красавіка 1930 году на сялян, увайшоўшых у колгасы;

г) збор паявых капіталаў і паявых укладаў у крэдытныя таварыствы і коопэрацыю ажыцьцяўляць толькі ў добраахвотным парадку, забараніць практыку прымусовых спагнаньняў, якая наглядаецца ў радзе выпадкаў;

д) забараніць практыку збору ўзносаў у ашчадкасы ў прымусовым парадку, якая наглядаецца ў некаторых раёнах;

е) лічыць закончаным збор задаткаў на трактары ў бягучым гаспадарчым годзе;

ж) вызваліць колгасы ад выплаты даўгоў па конфіскаванай кулацкай маемасьці, якая пераходзіць ва ўладаньне колгасаў.

3. Прапанаваць Наркамгандлю забараніць браць па контрактацыйных дагаворах на ўбой цельных кароў і кароў аднакароўных гаспадарак, якія ўваходзяць у колгас.

4. Запрапанаваць Колгасцэнтру:

а) забараніць адлічэньні ў даход колгасу ад заработкаў колгасьніка па-за колгасам большага проценту, чым гэта ўстаноўлена законам у адносінах ад прыбыткаў ад промыслаў на старане (ад 3 да 10 проц. заработку) незалежна ад тэрміну і месца работы;

б) абавязаць праўленьні колгасаў не рабіць перашкод колгасьнікам, якія жадаюць у вольны ад работ у колгасе час працаваць на абагуленых колгасных конях на звозных, лесазагатоўчых і інш. работах, прычым у гэтых выпадках устанавіць, што 40 проц. заработку колгасьніка ад такіх промыслаў застаецца за колгасьнікам, калі ён карыстаецца колгаснымі кармамі і 60-70 проц., калі ён корміць каня сваімі кармамі.

5. Прапанаваць СНК СССР скасаваць усе пастановы цэнтральных органаў, якія супярэчаць гэтай пастанове.

САВЕЦКІ ЗАКОН ПІШАЦЦА ДЛЯ ТАГО, КАБ ЯГО ВЫКОНВАЛ

Закон аб вывадзе моладзі з начных зьмен у хэмічнай прамысловасьці не знайшоў сабе адбітку у жыцьці. Вучняў перакідаюць з аднаго месца на другое. Яшчэ ня ўсюды створаны неабходныя ўмовы для працы

Канчаткова вывесьці падросткаў з начных зьмен, прыкласьці максымум увагі пытаньням пастаноўкі кваліфікацыі моладзі, стварыць належныя ўмовы для працы падросткаў—галоўныя задачы дню

Спыніць парушэньне законаў аб ахове працы моладзі

На цэлым шэрагу прадпрыемстваў пытаньне пастаноўкі вучнёўства і падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў пастаўлена з рук вон дрэнна. Вучняў перакідаюць з аднае працы на другую, з аднаго варштату на другі, не выдаюць спэцвопраткі і зусім ня ўздымаюць кваліфікацыі.

Ёсьць шэраг фактаў, калі ўмовы працы моладзі пастаўлены вельмі дрэнна. На цэлым шэрагу прадпрыемстваў яшчэ ня выжыты бясчынныя парушэньні кодэксу законаў аб працы.

Не малы час прашоў, як вышла пастанова ўраду аб вывадзе моладзі з начных зьмен у хэмічнай прамысловасьці. Але дагэтуль пастанова яшчэ не знашла дастатковага адбітку на вытворчасьці. Некаторыя заводы і іх цьвердалобыя кіраўнікі, як на заводзе „Кастрычнік" упіраюцца і „адмяняюць" закон аб абавязковым аслабаненьні моладзі з начных зьмен. Моладзь па старому працуе ўва ўсіх трох зьменах і гэта адбіваецца на пастаноўцы вучнёўства і здароўі вучняў.

Друкуемы сёньня матар'ял сыгналізуе небясьпеку. Гэта павінны ўлічыць тыя органы, да якіх адносіцца пытаньне падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Мы патрабуем безадкладна ажыцьцявіць пастановы аб вывадзе моладзі з начных зьмен у хэмічнай прамысловасьці, спыніць перакіданьне вучняў між майстрамі, стварыць належныя умовы, у якіх магчыма была-б далейшая праца па падрыхтоўцы кадраў. **Л. Гл.**

Вывесьці з начных зьмен

Пытаньне аб пераводзе падросткаў з начных зьмен у хэмічнай вытворчасьці ўзьнята даўно. Пастанова ЦК УсеЛКСМ па гэтаму пытаньню была вынесена яшчэ 24-га красавіка 1929 году. Пасьля гэтага такія-ж пастановы былі вынесены Наркампрацы СССР і БССР, у якіх вызначаліся нават і тэрміны для сканчэньня гэтай работы. Конкрэтна—не пазьней 1-га сьнежня 1929 году неабходна было вывесьці ўсіх падросткаў з начных зьмен у хэмічнай прамысловасьці. Прычым, гэты перавод не павінен адбіцца на колькасьці падросткаў, занятых у вытворчасьці. Здавалася-б, што пасьля такіх пастаноў не



Што закон, што пастановы,
Што ахова працы мне!—

Я закон абавязковы
Адмяняю для цябе!

магло быць і гутаркі аб непатрэбнасьці гэтага мерапрыемства.

Па 7 шклозаводах Беларусі на 6-ці ўжо выведзены падросткі з начных зьмен. Мэтад вываду такі: усе падросткі, што працавалі на начных зьменах, пераводзяцца ў адну зьмену. На заводзе „Домбаль" падросткі выведзены ў адну зьмену, на справе-ж працуюць ізноў у тры зьмены. Толькі на заводзе „Пролетары" вывад праведзен своечасова і поўнасьцю.

Завод-жа „Кастрычнік" (Бабруйскай акругі) зусім адмаўляецца ад гэтага мерапрыемства. Праўда, у сьнежні, па настаяньню фабзавкому, падросткі былі выведзены, але з прыездам новага дырэктара тав. Пісарава пастанова завкому была адменена. Тлумачаць гэта тым, што перавод адбіваецца па якасьці выпрацоўкі, на пастаноўцы індывідуальнага вучнёўства і п вялічваецца брак, і г. д. Ня гледзячы на налягаЊне прадстаўніка моладзі, гэтае рашэньне зацьвердзілі партколектыў і раённы камітэт партыі.

Таксама апраўдвае сябе мэтад брыгаднага навучаньня па выхадных днях. Гэты мэтад дае лепшыя вынікі, чым пастаноўка вучнёўства раней, калі моладзь была ў чатырох зьменах.

Вывад падросткаў ні ў якім разе не адбіваецца на працы астатніх рабочых, пры правільнай арганізацыі працы.

Таксама па матар'ялах, якія маюцца ад цэлага шэрагу шклозаводаў, гэтыя мерапрыемствы і на сёньнешні дзень сустракаюць з боку адміністрацыі дапамогу ў іх ажыцьцяўленьні.

Але завод „Кастрычнік" чамусьці выдзяляецца ад астатніх і ня ідзе насустрач. Зараз там ставіцца пытаньне аб зьняцьці двух чалавек броні ў сьлясарнай майстэрні і машынным аддзяленьні, якія навучаюцца каля 9 месяцаў.

Неабходна адпаведным арганізацыям прыцягнуць да адказнасьці адміністрацыю заводу за парушэньне пастаноў ураду з тым, каб гэтыя пастановы былі неадкладна праведзены ў жыцьцё.

М. Храпуновіч.

ПА 12-13 ГАДЗІН У СУТКІ

Рабочыя менскай гарадзкой станцыі МББ чыгункі працуюць ня менш за 12-13 гадзін у суткі. Праца на станцыі пачынаецца а 8 з паловай гадзіне раніцы і канчаецца а 10-11 гадзіне ўвечары. Тлумачыцца гэта тым, што на станцыі працуе толькі адна зьмена, і што зданы груз нельга атрымліваць на другі дзень.

Калі мы пачнем працаваць па 8 гадзін у дзень—пытаюцца рабочыя. Хто павінен зьвярнуць на гэта увагу? **Ведаючы.**

Абяцанкі — цацанкі...

На адчыненых будаўнічых курсах ЦІП'у павінна было займацца 400 чал. Але арганізатары гэтых курсаў такой колькасьці жадаючых не знашлі. На сёньнешні дзень мы бачым, што Наркампрацы ня можа абслужыць і тае колькасьці курсантаў, якая маецца. Курсанты знаходзяцца ў вельмі дрэнных эканомічных умовах, што адмоўна адбіваецца на пастаноўцы вучнёўства. Агульнажыцьцё, у якім знаходзяцца курсанты, больш падобна на хлеў для жывёлы, а не на жылое памяшканьне. Курсантам не выдаюцца абяцаныя абеды і абутак, дзякуючы чаму прыходзіцца часьцяком галадаць і хадзіць на працу разутымі.

Перад пачаткам курсаў Наркампрацы абяцаў даць курсантам матрацы, падушкі і коўдры, але зараз выдалі толькі матрацы і саламяныя падушкі, а коўдраў няма і, мабыць, ня будзе.

Пры такіх умовах жыцьця немагчыма нармальная вучоба і курсанты пачынаюць пакідаць курсы, разьяжджаюцца па хатах, а гэта пагражае зрывам падрыхтоўкі неабходных будаўнічых кадраў.

Падрыхтоўка кадраў да будаўнічага сэзону пад пагрозай зрыву. Належным органам патрэбна прыняць адпаведныя захады для папярэджаньня гэтага зрыву і стварэньня належных магчымасьцяй для падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў.

Курсант.

Спыніць „футбол"

У пякарні гарадзкога спажывецкага таварыства Рагачова працуе бронь вучань ІСЭР, які ня мае свайго сталага месца, ім кідаюцца, як футбольным мячам: адзін дзень працуе ў адным цэху, другі—у другім і вельмі часта па 10-15 гадзін у суткі. Адміністрацыі неабходна вызначыць яму месца і час яго працы.

СКРЭБАК.


Працуюць 8 гадзін

На заводзе „Зьвязда" пры ст. Капцэвічы ёсьць бронь вучні, паступіўшыя увосень 1929 году на завод. Вядома, што вучні ад 16 год да 18 павінны працаваць толькі 6 гадзін, але ў нас на заводзе гэтае правіла ня выконваецца.

Вучань Кацік К. *цэлымі тыднямі працуе па 8 гадзін, акрамя гэтага ставіцца майстрам* Брэгманам *на цяжкую працу. Майстар* Брэгман *добра ведае, што вучань павінен працаваць толькі 6 гадзін, але надзвычайна часта бывае так, што звыш-штатныя рабочыя ідуць дамоў, а вучні працуюць на тых мясцох, дзе павінны працаваць дарослыя рабочыя.* Мясцовая ахова працы гэтым пытаньнем не займаецца і вучні працуюць больш чым патрэбна і атрымоўваюць па нізкіх разрадах. Патрэбным органам неабходна заняцца гэтым пытаньнем і зрабіць свае вынікі.

РАБОЧЫ.

Новая гульня



Сваеасаблівы футбол.

Дзе ахова працы?

Бялыніцкі комбінат аб'яднае тры прадпрыемствы: два млыны і электрастанцыю. На гэтых прадпрыемствах вельмі дрэнна абстаіць справа з аховай працы. Рабочыя працуюць па 10-12 гадзін у дзень. Спэцвопраткай не задаволены, рабочыя электрастанцыі да гэтага часу нават зусім яе ня маюць. Рабочым Бялыніцкага млыну выдадзена нікуды ня вартая вопратка і валёнкі. Зімовыя штаны некаторым рабочым зусім ня выданы. Аптэчка ёсьць, але ў ёй нічога няма. Застаецца невядомым, чаму гэта Акрасаюз і іншыя організацыі, да якіх гэта датычыцца, ня цікавяцца пытаньнем аховы працы рабочых?

Лёгкі кавалерыст.

Патрэбна праверыць

Ня гледзячы на тое, што Цяцерынская навучальна-практыкавальная майстэрня адна ў Круглянскім раёне і другая па ліку ў Аршанскай акрузе,—акруговы і раённы інспэктарыяты Асьветы амаль не зьвяртаюць на яе ўвагі. У параўнаньні з мінулым годам праца і вучоба ў школе пагоршылася.

Інструктар сьлясарнага цэху ФАБРЫСТАЎ, заўважыўшы бязладзьдзе, выехаў працаваць у Воршу. Праз тры месяцы прыехаў новы інструктар і, паабяцаўшы шмат чаго зрабіць для нашага вучнёўства,—узяўся за справу.

Што-ж ён зрабіў дзякуючы сваёй здольнасьці і ўменьню? Рухавік, устаноўлены былым інструктарам, стаяў. Ня было каму пусьціць яго ў ход. Новы інструктар КУЛІКАЎ катэгорычна адмовіўся скарыстаць гэты рухавік, мотывуючы адсутнасьцю нафты, алінафту, масьлёнкі і г. д. Калі гэтыя матар'ялы былі дастаўлены, то Кулікаў знашоў другі адказ: „ГЭТЫ РУХАВІК ПАТРАБУЕ АХВЯР, ТАМУ, ШТО Ў ПРОЦЭСЕ РУХУ МОЖА РАЗАРВАЦЦА І КАГО-НЕБУДЗЬ ЗАБІЦЬ".

Рухавік да гэтага часу стаіць бяз працы. Вучні, як і раней пацеюць над рычагом такарнага станка. Тэхнолёгія мэталу, красьленьне выкладаюцца дрэнна. З боку інструктара вучням няма растлумачэньня.

Загадчык груба адносіцца да вучняў. Былі выпадкі, калі ён вучняў, а таксама і інструктара сталярнага цэху крыў „матам".

Інтэрнат знаходзіцца ў надзвычайна кепскім становішчы.

Усе гэтыя факты яскрава сьведчаць аб тым крытычным становішчы, у якім знаходзіцца профмайстэрня. Пры далейшай такой працы і вучобе існаваць немагчыма. Школу патрэбна праверыць і перш за ўсё патрэбна забясьпечыць больш працаздольнымі работнікамі, якія-б узьнялі працу і вучобу майстэрні.

ЛІХАЧ.



ВУЧАНЬ:—Дзядзька!.. Павучыцца-б!
АДМІНІСТРАТАР: — Адыйдзі.. не глядзі на мяне...

Няма спэцвопраткі

Нікому невядома ў якіх умов працуюць работніцы адкормачны пунктаў МЦРК і Белмясгандл. Мы прышлі туды, калі мянялася зьмена, каля 10 рабочых адкорм нага пункту Белмясгандлю пав ны былі прыступіць да прац. Трэба было апранацца ў спэцв пратку, але яе не аказалася. Ад работніца здымае брудны, мокр тыднямі нямыты халат і перад сваёй зьмене. Халатаў няма, б таў не закупілі, рабочыя мыю рукі адным кавалачкам мыла і в ціраюць ручніком, ад брудных х латаў і ад ручніка ў некатор работніц зьявіліся раны на рук які перашкаджаюць працы, пайсьці ў амбуляторыю няма ні кай магчымасьці, бо 8-мі гадзін рабочы дзень не захоўваецц. Ёсьць выпадкі, калі рабочыя выходзяць на працу, на што ад ністрацыя не зварочвае адпав най увагі.

Не захоўваецца таксама коле тыўны дагавор—большасьць ж чын выконваюць тую працу, як павінны рабіць мужчыны. Саюз та сама ня робіць усяго таго, шт яму патрэбна. Упаўнаважаным гэтым пункту зьяўляецца батра ка комсамолка—Надя Кавалёна. Ёй неабходна дапамагчы, але я ніякай дапамогі і кіраўніцтва атрымоўвае. На пункце вельмі дрэ на пастаўлена культурная масав праца.

Дрэйцэр.

ПОЛІТБОЙ--ПРАВЕРКА НЯ ТОЛЬКІ ПОЛІТЫЧНАГА ЎЗРОУНЮ, АЛЕ І ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЬЦІ КОМСАМОЛУ

Падрыхтоўка да ўсебеларускага політбою ідзе недапушчальна павольным тэмпам

Выканаць дырэктыву ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні раённых політбаёў у красавіку месяцы магчыма толькі тады, калі камітэты зараз-жа наладзяць праверку працы політшкол, політгурткоў, прымуць шэраг захадаў да максымальнага ўзмацненьня тэмпаў падрыхтоўкі

Політбой сустрэць узброенымі

ЦК ЛКСМБ пастанавіў у выніку ..авядзеньня трохмесячніку бела..скай і нацменаўскай пролетар..ай культуры правесьці ўсебела..скі політбой, перад усебеларус..м політбоем павінны быць пра..дзены раённыя і акруговыя по..тбоі.

„Політбой ставіць сваёй мэтай ..яхам спаборніцтва падкаваць ..ю комсамольскую організ цыю ..дамі па нацыянальнаму пытань..ю і пяцігодцы“ (з кніжкі „За про..тарскую культуру“). Патрэбна ..памятаць, што сродкамі „абаро..ы“ зьяўляюцца ня толькі тэорэ..чныя веды, але і сума гаспадар..ых дасягненьняў комсамольскай ..рганізацыі як у прамысловасьці, ..к і ў сельскай гаспадарцы. Велі..ыня і важнасьць задач, якія ста..яцца перад організацыяй у зьвяз..у з політбоем, зразумелыя. А та..у зусім зразумелым зьяўляецца ..е, што поўнае выкананьне гэтых ..адач магчыма толькі пры ўмове, ..алі ва ўсіх зьвеньнях комсамоль..кай організацыі будзе разгорнута ..паведная падрыхтоўчая праца. ..олітбой патрэбна сустрэць ва ..еўзброеньні. Як-жа рыхтуецца ..рганізацыя да політбою? Ці скрозь разумелі важнасьць гэтага мера..рыемства? Хоць камітэты пачалі ..рушыць гэту справу, вынесена ..мат і ня дрэнных пастаноў, у шэ..лiся з адхіленьнем ад партыйнай лініі на практыцы і якіх посьпехаў яны дабіліся на гаспадарчым фронце.

Надзвычайна вялікае значэньне зараз набывае пытаньне пастаноўкі культурнай масавай працы як на прадпрыемствах, так і асабліва ў вёсцы. Патрэбна ў справу падрыхтоўкі да політбою ўключыць пытаньне пастаноўкі культурнай працы. Мы ўжо маем некаторыя добрыя пачынаньні ў справе праверкі становішча і наладжваньня політыка - асьветнай працы на вёсцы. У гэтым напрамку асобныя райкомы і вытворчыя ячэйкі наладжваюць выхад культурных брыгад-калён. Гэта пачынаньне патрэбна скарыстаць усёй організацыі. Але выездам адных калён пытаньне наладжваньня культурнай працы вырашыць немагчыма. Камітэтам, ячэйкам патрэбна заняцца сыстэматычнай праверкай і дапамогай у наладжваньні працы хат-чытальнь, чырвоных куткоў, установкі і належнага выкарыстаньня радыё-прыёмнікаў і інш.

Зараз у парадку правядзеньня мерапрыемстваў трохмесячніку шэраг гарадзкіх ячэек комсамолу і цалкам прадпрыемствы ў падшэфных колгасах, вёсках організавалі чырвоныя куткі, набылі для колгасаў бібліотэчкі, радыё-установкі і інш., але гэта ў большасьці ў парадку кампаній. Як мясцовым організацыям, так і вытворчым—шэфствуючым ячэйкам неабходна ўжыць усе захады, каб пачатую працу замацаваць. Патрэбна з усёй рашучасьцю змагацца з элемэнтамі аполітычнасьці ў культутурна-масавай працы, рашуча біць па імкненьнях зьвесьці культурна-масавую працу да голай „культуркі“. Зараз як ніколі неабходна насычыць культурна-масавую працу выразным політычным зьместам.

Шэраг мерапрыемстваў гаспадарча-політычнага зьместу, якія зараз праводзяцца на вёсцы (перавод колгасаў на новы статут, організацыя працы ў колгасах, вясеньняя пасеўная кампанія, пытаньне правядзеньня колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы, барацьба са скажэньнямі партыйнай лініі і інш.), павінны знайсьці пэўны адбітак у культурна-масавай працы як ячэйковай, так і ў вёсцы наогул.

Культурна-масавая праца павінна быць магутнай зброяй популярызацыі політычных гаспадарчых мерапрыемстваў. Гэтага з усёй настойлівасьцю патрабуе сучасны пэрыод шырока разгорнутага колгаснага руху і на грунце гэтага абвостранай клясавай барацьбы.

..агу месц (Магілеў) больш менш ..давальняюча разгортваецца гэтая ..права. Але агульнае становішча ..адрыхтоўкі да політбою, тэмпы ..этай працы далёка не здавальняючыя. У шэрагу месц камітэты ..е забясьпечылі ячэек належнымі ..руючымі і мэтадычнымі матар'..ламі.

Трэба з усёй рашучасьцю пад..рэсьліць, што калі ў горадзе тое..е і робіцца, дык вясковая орга..ізацыя яшчэ не раскачалася. Мы ..усім ня памылімся, калі скажам, ..то далёка ня скрозь складзена ..рамадзкая думка навакол гэтага ..ажнага політычнага мерапрыем..тва.

Часу да правядзеньня ўсебела..ускага політбою засталося мала. ..омсамольскім комітэтам і ячэйкам ..атрэбна як мага налегчы на пад..ыхтоўку да політбою, шляхам ..айлепшага правядзеньня ячэйко..ых, раённых політбаёў, наладж..аньня добрай пастаноўкі працы ..олітшкол і політгурткоў. Праца ..а падрыхтоўцы да політбою па..інна быць цесна ўвязана з пад..ыхтоўкай да гадавіны соцспа..орніцтва з тым, каб прысьці да ..олітбою з максымальнымі пось..ехамі ня толькі ў галіне тэорэ..ычна - політычнай падрыхтава..асьці, але і паказаць, як кожная ..чэйка і асобныя організацыі, ра..ам з вывучэньнем тэорыі, змагаліся з адхіленьнем ад партыйнай лініі...

В. С.

Як некаторыя комсамольцы разумеюць добраахвотнасьць політвучобы

„Хачу вучуся, хачу не“...

РАПАРТУЮЦЬ:

На гэтым ня спынімся

(Гомельскі белпэдтэхнікум)

У правядзеньне трохмесячніку ўцягнуты шырокія масы комсамольцаў і ўсяго студэнцтва. За гэты час мы прарабілі:

НА ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Створаны чатыры брыгады на заводах: „Рухавік Рэволюцыі“, Полесдрук і інш. Брыгады правялі наступную працу: завербавана падпісчыкаў на „Чырвоную Зьмену“ 212 чалавек, на „Комсомольскую Правду“—99; закуплена і абсталёвана бібліотэка. Праведзена 17 гутарак па пытаньнях, якія вызначаны дырэктывамі па трохмесячніку, організаваны дзьве юнкораўскія брыгады і 5 гурткоў па вывучэньню беларускай мовы.

НА ВЁСЦЫ. Завербавана 311 падпісчыкаў на „Чырвоную Зьмену“. Створана адна юнкораўская брыгада, організавана і абсталявана 8 чырвоных куткоў. Установлена тры радыё-прыемнікі. Праведзена 28 мастацка-культурных вечароў, сабрана і перадана чырвоным куткам 100 кніжак, організаваны адзін гурток па вывучэньню беларускай мовы.

У ТЭХНІКУМЕ. Па пытаньнях правядзеньня трохмесячніку заключана соцумова з рабфакам, створан куток „Чырвонай Зьмены“ які прыцягнуў да сябе вялікую колькасьць чытачоў. Праведзен дыспут на тэму: „Ці будзе з мяне будаўнік соцыялізму“. Праведзен шэраг дыспутаў аб асобных творах Зарэцкага. Праведзен політбой па пытаньнях нацыянал-дэмократызму, правага ўхілу і інш. Колектывам праведзен вечар трох заводаў па пытаньнях трохмесячніку. У правядзеньне трохмесячніку ўцягнута ўся маса студэнцтва. Ячэйка на гэтым не супынілася. зараз намечаны і праводзіцца яшчэ цэлы шэраг мерапрыемстваў.

Рудакоўскі.

Належнага пералому яшчэ няма

(Магілеў)

Райкомы і ячэйкі ЛКСМБ яшчэ і да гэтага часу не дастаткова мобілізавалі масы комсамольцаў, рабоча-батрацкае і бядняцка-серадняцкае моладзі на выкананьне задач, пастаўленых трохмесячнікам.

У асяродку актыву існуе недаацэнка політычнай важнасьці трохмесячніку, а асобныя райкомы падзяляцкі падышлі да гэтае работы.

Што зроблена?

Добра наладжана колектыўнае наведваньне тэатру і абгаварэньне прагледжаных пастановак (горад).

Па ўсіх ячэйках складзены брыгады па правядзеньню трохмесячніку і вылучаны кадры дакладчыкаў па гэтаму пытаньню для ячэек (горад, Чэрыкаў).

Высланы брыгады райактыву ў вёскі па праверцы бібліотэк, хатчытальняў, у выніку чаго выкінута шмат нягодных кніжок (Чэрыкаў).

Організаваны 3 сельска-гаспадарчыя агранамічныя гурткі і 3 чырвоныя куткі пры колгасах, кіраўнікамі якіх зьяўляюцца комсамольцы (Чэрыкаў).

Чэрыкаўская райорганізацыя, шляхам пасылкі брыгад у вёскі, распаўсюдзіла рознай літаратуры на 947 руб.

Ячэйка Хлебазаводу (горад) аглядвела сваю бібліотэку, праверыла прымацованы да яе лікпункт і перавяла работу ячэйкі на беларускую мову. Ячэйка Белпэдтэхнікуму агледзіла ўсе лікпункты гораду.

Ячэйка друкароў (горад) праверыла сваю бібліотэку і організавала політгурток па падрыхтоўцы да політбою.

Чачэвіцкая організацыя адчыніла адзін лікпункт пры кожнай з 4-х ячэек гурткі па вывучэньню нацыянальнай політыкі партыі.

Значны штуршок у далейшай рабоце па трохмесячніку далі, прабыўшыя некалькі дзён у г. Магілеве і некаторых раёнах, беларускія пролетарскія пісьменьнікі (ЯКУБ КОЛАС, ЗМІТРОК БЯДУЛЯ, БРОЎКА, НІКАНОВІЧ, АЛЯХНОВІЧ), якія абслужылі профсаюзы, гарадзкую комсамольскую організацыю і навучальныя ўстановы гораду.

Добра разгорнута падрыхтоўка да політбою ў гарадзкой організацыі.

Але ня гледзячы на гэта, масы комсамольцаў цалкам ня прыцягнуты да практычнага ажыцьцяўленьня задач трохмесячніку і не дастаткова мобілізаваны на рашучую барацьбу з клясава-варожымі ўплывамі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве і беларускім нац.-дэмократызмам, як самым небясьпечным у сучасны пэрыяд.

Як акруговы гэтак і некаторыя раённыя штабы па кіраўніцтву і правядзеньню трохмесячніку бязьдзейнічаюць.

Комсамольцы яшчэ і зараз ня ведаюць сутнасьці нацдэмократызму. Ніякага ўдзелу ў трохмесячніку ня прымае настаўніцтва.

Слаба пастаўлена справа з беларусізацыяй. Вось факт:

У гэтым месяцы адбылася конфэрэнцыя гарадзкой комсамольскай організацыі па абгаварэньню прагледжаных пастановак. Седзячы на конфэрэнцыі, здавалася, што яна праходзіць у Маскве, альбо ў Ленінградзе, бо ні дакладчык (дырэктар мастацкіх прадпрыемстваў), ні выступаючыя ў спрэчках, за выключэньнем апа-работніка гаркамолу, ніхто нават не заікнуўся на беларускай мове.

У яўрэйскім Чэрыкаўскім дзетдоме, пры праверцы літаратуры, знашлі яўрэйскі талмуд.

Комсамол Магілеўшчыны павінен зараз жа мобілізаваць масы комсамольцаў і працоўнай моладзі на правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў трохмесячніку, на рашучую барацьбу з клясава-варожымі плынямі ў нацыянальна-культурным „будаўніцтве.

Б. Лiўшыц.

г. Магілеў.

„Цішэй едзеш, далей будзеш“

У хуткім часе павінен адбыцца політбой паміж Фрунзэўскай і Кастрычнікаўскай раённымі організацыямі. Падрыхтоўка да політбою ў комсамольскім колектыве Менскага Політэхнікуму ідзе надзвычайна павольна. Вывешаны вялізарныя плякаты з пастановай колектыву КСМ і тлумачэньнямі аб задачах і ўмовах політбою. Але як-жа ідзе падрыхтоўка? Ня ўсе ячэйкі ўзяліся па-сур'ёзнаму за гэтую важную справу. Грамадзкая думка навокал пытаньня політбою яшчэ ня складзена. Гурткі, якія працуюць па падрыхтоўцы да політбою, вельмі часта зрываюцца, а тыя гурткі, якія займаюцца, праводзяць сваю працу далёка нездавальняюча. Ня ўсе прымаюць удзел у прапрацоўваемых пытаньнях. На гурткі прыходзяць у большасьці пад палкай, а таму і займаюцца іншымі справамі: падрыхтоўкай да лекцый і інш. Такія „тэмы“ ў рабоце напамінаюць славутую прыказку—„цішэй едзеш далей будзеш“.

З свайго боку я прапаную да выстаўленых тэм у якасьці абароны ад кожнай ячэйкі навучальных установ, якія будуць удзельнічаць у політбоі, выставіць у якасьці абароны наступнае:

1. Найхутчэйшая, пры добрай якасьці, падрыхтоўка кадраў.

2. Выкананьне заключаных умоў па соцспаборніцтву і лепшай працы ўдарніцтва.

3. Удзел у колектывізацыі і асабліва організацыі працы ў колгасе. **Акунёў.**

Політбой правалілі

У Гомельскай школе мэталістых бюро комсамольскай ячэйкі вельмі дрэнна падрыхтавала політбой. Сярод пытаньняў, падрыхтаваных бюро да політбою, ня было ніводнага конкрэтнага пытаньня, а ў большасьці пытаньні агульныя (вёска Сеньні і г. д.). Навокал справы політбою ня створана грамадзкае думкі, дзякуючы чаму, як комсамольцы, так і астатнія вучні політбоем не зацікаўлены. У выніку такой „падрыхтоўкі“ у першы-ж дзень політбою зьявілася зусім мала ўдзельлікаў. Характэрна, што нават самі члены бюро ня прынялі ніякага ўдзелу ў політбоі. Па прыкладу „актывістых“ комсамольцы, якія былі ў першы дзень, на другі дзень не зьявіліся.

Такім чынам, дзякуючы нядбайным адносінам бюро, політбой сарваны.

НАЖДАКОЎ.

Актывісты гомельскай школы мэталістых „ідуць“ на політбой

З чым прыйдзе Жыткавіцкая ячэйка да політбою?

У Жыткавіцкай местачковай ячэйцы КСМ (Мазыршчына) політвучоба праходзіць дрэнна. У ячэйцы няма сталых заняткаў. Сэкратар і бюро ячэйкі аб гэтым не клапоцяцца. Комсамольцы ў большасьці політычна няпісьменныя і ня гледзячы на гэта, політшколы не наведваюць. Газэт амаль ніхто ня чытае.

З чым прыйдзе жыткавіцкая ячэйка да політбою, які павінен у хуткім часе адбыцца?

Лайхтман.

У нядзелю, 6-га красавіка, у 6 з паловаю гадзін увечары, у памяшканьні Дому Комасьветы адбудзецца сход комсамольскага актыву.

Парадак дню:

1. Аб выніках пленуму ЦК КП(б)Б, дакладчык тав. Славінскі.

Комсамольцы-партыйцы ад партсходаў аслабаняюцца. Уваход па разданых білетах.

Тэлеграмы

„Польшча—парахавы склеп на ўсходзе Эўропы“

Аб якой катастрофе гаворыць Цэленс

РЫГА, 3. Былы міністр замежных спраў, соцыял-дэмократ Цэленс выступіў у сойме з вялікай прамовай, у якой выкрываў ваенныя пляны імпэрыялістых. „Усе вялікія дзяржавы,—заявіў Цэленс,—ня гледзячы на скліканыя імі конфэрэнцыі па разбраеньню і г. д. у цішы рыхтуюцца да вайны. Калі рабочая кляса не акажа дастаткова-магутнага ўзьдзейнічаньня на гаспадарчую і політычную дзейнасьць буйных капіталістычных дзяржаў, дык у самы бліжэйшы час пачнецца катастрофа, якая па сваіх памерах будзе больш грознай, чымся катастрофа 1914-18 г. г.“

Далей Цэленс падкрэсьлівае, што на Ўсходзе Эўропы небясьпека вайны ствараецца антысавецкімі плянамі ў Польшчы. „Куды ідзе Польшча,—гаворыць прамоўца,—аб гэтым лепш за ўсё гаворыць яе вайсковы бюджэт, які складае 40 проц. усяго наогул бюджэту. Над разьвіцьцём польскага мілітарызму павінны сур'ёзна прызадумацца суседзі Польшчы, у тым ліку і Латвія. Польшча ў сучасны момант грае ролю парахавага склепу ва Ўсходняй Эўропе“.

Увага: Прамова Цэленса азначае, бязумоўна, ня клопаты латвійскіх соцыял-дэмократаў аб захаваньні міру, а іх страх перад уцягненьнем Латвіі ў небясьпечную вайсковую авантуру. Як відаць з прамовы Цэленса, ён баіцца, што няўдача гэтай авантуры прывядзе да ператварэньня імпэрыялістычнай вайны ў грамадзянскую і да заваяваньня ўлады пролетарыятам. Гэта ён называе „катастрофай“.

Крывавая сутычка бастуючых батракоў з паліцыяй

Шмат батракоў цяжка паранены

ДАНЦЫГ, 3. Забастоўка батракоў у 3-х сельска-гаспадарчых акругах вольнага гораду Данцыгу працягваецца. Учора ў паселішчы Штэгэне (у 30 кілёмэтраў ад Данцыгу) адбылася крывавая сутычка паміж бастуючымі і коннай жандармэрыяй. Атрад коннай жандармэрыі напаў на групу бастуючых батракоў у 60 чалавек. Адзін з загнаных у Віслу батракоў утапіўся. Сярод батракоў ёсьць цяжка параненыя. Сёньня ў Данцыгу адбылася організаваная компартыяй рабочая дэманстрацыя салідарнасьці з бастуючымі.

Першы пленум усеэўрапейскага сялянскага камітэту

БЭРЛІН, 3. Учора адбыўся першы пленум усеэўрапейскага сялянскага камітэту абранага першым усеэўрапейскім конгрэсам працоўнага сялянства. Пленум абраў сэкратарыят у складзе 7 членаў і бюро камітэту у складзе 3 членаў.

Кіраўніком камітэту абран Рыхтэр, які стаяў на чале Ўсеэўрапейскага камітэту па падрыхтоўцы конгрэсу. У камітэт уваходзяць 24 члены, у тым ліку прадстаўнікі працоўнага сялянства Фінляндыі, Голяндыі, Баўгарыі, Чэха-Славакіі, Альбаніі, Польшчы, Італіі, Швэйцарыі, Норвэгіі, Бэльгіі, Ірляндыі, Латвіі, Нямеччыны, Аўстрыі, Францыі і Гішпаніі.

Дэмонстрацыі беспрацоўных у Вэнгрыі

ВЕНА, 3. Як паведамляюць з Будапешту, у шэрагу провінцыйных гарадоў Вэнгрыі—Дверое, Печэ і інш., за апошнія два дні адбываліся новыя дэмонстрацыі беспрацоўных. Паліцыя ўсюды нападала на беспрацоўных і разганяла іх.

Новы налёт на „Ротэ-Фанэ“

БЭРЛІН, 3. Бэрлінская паліцыя зрабіла нечаканы налёт на памяшканьне „Ротэ Фанэ“, які суправаджаўся доўгім вобыскам. Вобыск адбыўся бяз усякага поваду і ня даў ніякіх вынікаў.

Вясеньні зьлёт

Дырэктар ангельскага нафтавага таварыства „Роял-Дэтч“ Дэтэрдынг прыляцеў на аэроплане ў Парыж для нарады з Тардзье і зараз-жа пасьля спатканьня зьвярнуўся ў Лёндан.

З намёкаў газэт выцякае бясспрэчная сувязь гэтага візыту з міжнароднай антысавецкай кампаніяй.

(З газэт).

Воран к ворану ляціць...

На лёнданскай гаварыльні па „разбраеньню“

Англа-француская згода

РЫМ, 3. Па паведамленьню „Джорнале д'Італія“, Англія і Францыя прышлі на лёнданскай конфэрэнцыі да згоды на наступнай аснове: Англія абавязваецца аказваць Францыі на Міжземным моры падтрыманьне ў межах, прадугледжаных статутам Лігі Нацый, лёкарнскім дагаворам і пактам Келога; узамен гэтага Францыя значна скарачае свой ваенны флёт; да згоды павінна быць прыцягнута Італія з тым, аднак, што Францыя па ранейшаму адхіляе патрабаваньні Італіі аб роўнасьці італьлянскага і францускага флётаў. «Джорнале д'Італія» заяўляе, што згода Англіі на падтрыманьне Францыі раўналежна заключэньню політычнай ваенна-марской згоды, якая мабыць выходзіць з-за межаў Міжземнага мора. Газэта катэгарычна заяўляе, што ня можа быць і гутаркі аб прылучэньні Італіі да англа-францускай згоды.

„Разбраеньне“ па-румынску

ВЕНА. 3. Па афіцыйнаму паведамленьню з Бухарэсту міністр фінансаў зацьвердзіў адчыненьне надзвычайных крэдытаў у 500 мільёнаў лей для „самых тэрміновых патрэб“ румынскай арміі.



У маі месяцы рэдакцыя газ. „Чырвоная Зьмена“ організоўва[е] масавую ўсебеларускую экскурсію-дэлегацыю комсамольцаў працоўнай моладзі Беларусі на Украіну

Кожны камітэт, кожная комсамольская ячэйка павінны пабесьці шырокую работу па растлумачэньню політычнай важнасьці экскурсіі

Усім АК, РК і ячэйкам ЛКСМБ

У маі месяцы гэтага году рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ рыхтуе вялікую масавую экскурсію-дэлегацыю комсамольцаў і працоўнай моладзі Беларусі ў колькасьці 300 чалавек па маршруту—Гомель—Кіеў—Днепрабуд.

Гэтаму мерапрыемству, акрамя экскурсійнай мэты, надаецца вялікае політычнае значэньне. Экскурсія зьяўляецца таксама адным з вялікіх мерапрыемстваў трохмесячніку беларускай пролетарскай культуры. У час прабываньня экскурсіі ў Кіеве і Днепрапятроўску будуць наладжаны для абмену вопытам у рабоце вечары сустрэч з гарадзкімі організацыямі ЛКСМУ, акрамя гэтага ў г. Кіеве будуць падведзены папярэднія вынікі выкананьня соцдагавору, заключнага паміж Менскай і Кіеўскай організацыямі ЛКСМ.

Улічваючы важнасьць гэта мерапрыемства ЦК прапануе навокал гэтага ўтварыць грамадзкую думку і правесьці належную працу ў організацыі. Склад удзельнікаў экскурсіі ад вашай акругі неабходна будзе аформіць, як дэлегацыю ад вашай організацыі.

У выкананьне гэтага неабходна на сходах ячэек з удзелам беспартыйнай рабочай моладзі зрабіць належныя інформацыі аб гэтай экскурсіі-дэлегацыі і таксама абгаварыць кандыдатуры таварышоў, якія жадаюць удзельнічаць у гэтай экскурсіі. Гэта мерапрыемства неабходна асабліва популярызаваць на прадпрыемствах, у саўгасах і колгасах з мэтай уцягненьня рабочай, батрацкай, бядняцкай і колгаснай моладзі для ўдзелу ў экскурсіі. Неабходна, каб ячэйкі часткова дапамаглі матар'яльна таварышом, якія жадаюць прыняць удзел у экскурсіі і ня маюць на гэта дастаткова сродкаў.

Пры правядзеньні гэтага мерапрыемства неабходна даручаць працу ўпаўнаважаным газэты „Чырвоная Зьмена“, у АК, РК і ячэйках ЛКСМБ.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ—**Палякоў**.
Загадчык аддзелу адукацыі і быту ЦК ЛКСМБ—**Шоламаў**.

Умовы экскурсіі

Кошт экскурсіі па Дняпры на аднаго чалавека, пачынаючы з Гомелю з поўным абслугоўваньнем (праезд параходам, па чыгунцы, харчаваньне, інтэрнат, трамваі і інш.)—46 руб. і без праезду па чыгунцы—39 руб. (для чыгуначнікаў і тых, хто мае дармовы праезд па чыгунцы).

Усе жадаючыя ўдзельнічаць у экскурсіі павінны падаць заявы ў экскурсійную камісію газ. „Чырвоная Зьмена“.

Заявы прымаюцца толькі да 10 красавіка.

Грошы ўносяцца: першы ўзнос—15 руб. разам з заяваю да 10 красавіка (заява бяз першага ўзносу разглядацца ня будзе) другі ўзнос—15 р. да 20 красавіка і апошні ўзнос—16 руб. да 5 мая.

Заявы і грошы перасылайце па адрасу: г. Менск, Комсамольская 25. экскурсійная камісія газэты „Чырвоная Зьмена“.

УВАГА: экскурсанты з усіх акруг павінны будуць прыехаць у г. Гомель за свой кошт.

Узьнята пытаньне аб прадстаўленьні экскурсантам з дальніх акруг ільготы ў 50 проц. для праезду да г. Гомелю.

Экскурсійная камісія газ. „Чырвоная Зьмена“.

Запявалы экскурсіі

Ва ўсебеларускай экскурсіі на Украіну прымае ўдзел беларускі ТРАМ у поўным складзе.

Задача ТРАМ'у—быць запяваламі экскурсіі: у вагоне, на параходзе, на астаноўках, быць масавым організатарам; рабіць сьпевы, гульні, масавыя скокі, складанаю часткаю экскурсіі. У Кіеве і Днепрапятроўску на вечарох сустрэчы з украінскім комсамолам організаваць, разам з усімі экскурсантамі, самадзейныя мастацкія выступленьні.

Зараз Беларускі Трам шпаркім тэмпам рыхтуецца да свайго першага спэктаклю, напісанага, афармленага і пастаўленага колектывам. Гэты спэктакль Трам мяркуе весьці на Украіну.

Акрамя гэтага, рыхтуецца шэраг эстрадных выступленьняў: сьпевы (сольныя і групавыя), скокі (эстрадныя і масавыя) і музычныя нумары.

Духавы оркестр Траму рыхтуе шэраг концэртных нумароў.

... Загрыміць на параходзе духавы оркестр, будуць раздавацца частушкі запявал. Задрыжыць палуба параходу ад масавых скокаў.

Знойдуцца ў складзе экскурсіі і гарманістыя, сьпевакі, танцоры,—па маладому, весела і па-комсамольскі задорна пройдуць два тыдні адпачынку.

Запявалы экскурсіі — Белтрамаўцы—не падкачаюць.

Запявала.

Рыхтуйцеся!

Комсамольцы БССР, рыхтуй[цеся] да сустрэчы з комсамольцамі УС[СР] —Кіеўскай і Днепрапятроўскай [ор]ганізацыямі!

Ячэйкі, падагульце свае д[ася]гненьні і вопыт работы, каб п[ры] вашых прадстаўнікоў-удзельні[каў] экскурсіі на Украіну—абмяня[цца] вопытам працы.

Кожная экскурсія-дэлегацыя [па]вінна мець падагуленыя в[ынікі] аб працы сваёй організацыі.

Комсамольскай організа[цыі] Менскай акругі праз паўтара, м[еся]ца, у час прабываньня экскур[сіі-] дэлегацыі ў гор. Кіеве, буд[уць] падводзіцца папярэднія вынікі [вы]кананьня соцдагавару, заключа[нага] з Кіеўскай організацыяй ЛК[СМ] Украіны.

Лепшыя ўдарнікі БССР павін[ны] будуць падзяліцца вопытам св[аёй] працы з маладымі ўдарнікамі УС[СР].

Масавікі і зацейнікі, рыхтуй[цеся] да ўдзелу ў масавай экскурсіі [па] Дняпры!

Праверце!

АК РК і ячэйкі, што вамі зроб[ле]на па выкананьню пастановы [ЦК] ЛКСМБ ад 1-га сакавіка 30 г. [па] пытаньню аб усебеларускай [эк]скурсіі комсамольцаў і працоў[най] моладзі Беларусі на Украіну?

Упаўнаважаныя газ. „Чырво[ная] Зьмена“, што вы конкрэтна зра[білі] ў ячэйцы і на прадпрыёмстве [па] популярызацыі усебеларускай [эк]скурсіі-дэлегацыі на Украіну?

Сьпяшайцеся!

Колектывы і асобныя тавары[шы,] хто рыхтуецца да ўдзелу ва [ўсе]беларускай экскурсіі на Украі[ну] па Сожы-Дняпры і Дняпроў[скім] парогам,—зараз-жа перасыла[йце] заявы і грошы па адрасу: [г.] Менск, Комсамольская 25, Экск[ур]сійная камісія газ. „Чырво[ная] Зьмена“.

Наш выклік

Мы, комсамольцы - працаў[нікі] БДТ-2, заклікаем усіх працаўні[коў] БДТ-2, БДТ-1, БДЯТ і БДВТ [д]а адному паказу ў бліжэй[шы] свой выхадны дзень на карыс[ць] экскурсіі-дэлегацыі, якая орг[ані]зуецца рэдакцыяй газэты „Чы[р]воная Зьмена“, па маршруту: [Го]мель—Кіеў—Днепрабуд, з мэ[тай] абмену вопытам працы паміж к[ом]самолам Беларусі і Украіны. [Гэ]та экскурсія зьяўляецца адным з б[уй]ных мерапрыемстваў трохмесячні[ку] беларускай пролетарскай і нац[ыя]нальнай культуры.

Стэльмах, Заговалка, Гэ[...]рэлаў, Гэльман, Матус[е]віч, Шэлях, Эгуткін, Со[]калаў і Жораў.

Паведамленьне

КАСТРЫЧНІКАЎСКІ РК ЛКС[МБ]. Сёньня ад 6 да 8 гадзін увечары, [у] памяшканьні РК ЛКСМБ адбудз[ецца] консультацыя па пытаньнях пад[рых]тоўкі да Ўсебеларускага політбою.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.
Галоўлітбел № 599